Выкананне тэставых заданняў з'яўляецца важным этапам праверкі набытых ведаў, іх практычнага замацавання, падрыхтоўкі да ЦТ. Тэсты па беларускай мове могуць мець рознаўзроўневую структуру, гэта значыць ад больш простых (1-ы ўзровень), якія адпаведна ацэньваюцца (адзнакі 3 – 5), да ўскладненых (2-і ўзровень, адзнакі 6 – 8; 3-і ўзровень, адзнакі 9 – 10). Вучань можа самастойна выконваць заданні ўсіх тэставых узроўняў, паглыбляючы свае веды, і тым самым рыхтавацца да праверачных работ.

## НАЗОЎНІК

Першы ўзровень

### Частка А

**А1.** Адзначце назоўнікі:
1) камюніке;
2) нешта;
3) дзясятка;
4) увечары;
5) сем.

**А2.** Адзначце канкрэтныя назоўнікі:
1) мысленне;
2) дождж;
3) птаства;
4) ружа;
5) ластаўка.

**А3.** Адзначце назоўнікі першага скланення:
1) возера;
2) пад'ём;
3) адліга;
4) страха;
5) хадзьба

**А4.** Адзначце назоўнікі жаночага роду:
1) калега;
2) какава (напой);
3) сабака;
4) таполя;
5) шчаня.

**А5.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчатак - ***а***:
1) асіннік;
2) нос;
3) мільён;
4) ячмень;
5) баскетбол.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А6.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме меснага склону адзіночнага ліку маюць канчатак - ***е***:

1) край;
2) селянін;
3) вольха;
4) рэха;
5) сяло.

**А7.** Адзначце назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ліку:

1) карэнне;
2) корань;
3) чалавек;
4) змрок;
5) садавіна.

**А8.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме назоўнага склону множнага ліку маюць канчатак - ***ы***:

1) грамадзянін;
2) ноч;
3) мох;
4) горад;
5) камень.

**А9.** Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:

1) завязь;
2) лідэр;
3) Нью-Ёрк;
4) савана;
5) дэзынфармацыя.

**А10.** Адзначце назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам:

1) падаконне;
2) драбяза;
3) гадоўля;
4) прыўзнятасць;
5) токар.

**Частка В**

Знайдзіце ў сказе назоўнік у форме меснага склону адзіночнага ліку і запішыце гэты назоўнік у пачатковай форме.

*Снегавы пыл заблішчаў на сонцы, вецер падхапіў яго, закруціў над платформай і памчаў за вагоны.*

□□□□□□□□□□□

Другі ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце рэчыўныя назоўнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) шоўк;
2) туман;
3) цукар;
4) аспірын;
5) завея.

**А2.** Адзначце зборныя назоўнікі:
1) лісце;
2) моладзь;
3) золата;
4) зерне;
5) крапіва.

**А3.** Адзначце назоўнікі трэцяга скланення:
1) гусь;
2) гар;
3) кроп;
4) верф;
5) шыр.

**А4.** Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:
1) палын;
2) жэрабя;
3) медаль;
4) шафа;
5) мазоль.

**А5.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчатак - ***у***:
1) твар;
2) авёс;
3) Нёман;
4) конкурс;
5) пад'ём.

**А6.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме меснага склону адзіночнага ліку маюць канчатак - ***у***:
1) Мележ;
2) Шамякін;
3) садавод;
4) хірург;
5) зямляк.

**А7.** Адзначце назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку:
1) успаміны;
2) крупы;
3) дзверы;
4) грудзі;
5) моры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А8.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону множнага ліку маюць нулявы канчатак:

1) зорка;
2) завод;
3) поле;
4) асаблівасць;
5) прэмія.

**А9.** Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:

1) Растоў на Доне;
2) паў-Еўропы;
3) норд-ост;
4) макрарэльеф;
5) максіспадніца.

**А10.** Адзначце назоўнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:

1) прыцемкі;
2) непаўналецце;
3) міжрадкоўе;
4) пасадка;
5) пералетак.

**Частка В**

Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі назоўнікамі і іх сінтаксічнай роляй у сказе. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Стаць прафесіяналам – **шчасце**. | 1. Дзейнік. |
| Б. **Жыццё** пражыць – не поле перайсці. | 2. Выказнік. |
| В. Над **лугам** стаяў малочны туман. | 3. Азначэнне. |
| Г. **Жыта** звесіла шыю. | 4. Акалічнасць. |
| | 5. Дапаўненне. |

□□□□□□□□□□□

Трэці ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:

1) вучнёўства;
2) нябожчык;
3) гном;
4) таварыства;
5) патрыёт.

**А2.** Адзначце абстрактныя назоўнікі:

1) лямант;
2) шашлык;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) ліпняк;
4) гіпноз;
5) сумежжа.

**А3.** Адзначце рознаскланяльныя назоўнікі:
1) мужчына;
2) ляўша (Алена);
3) імя;
4) птушаня;
5) маці.

**А4.** Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:
1) Токіа;
2) мікада;
3) цэцэ;
4) журы;
5) Хакайда.

**А5.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць розныя канчаткі ў залежнасці ад лексічнага значэння:
1) хлеб;
2) гардэроб;
3) лістапад;
4) ранак;
5) ясень.

**А6.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме давальнага склону адзіночнага ліку маюць канчатак - ***і***:
1) Ілья;
2) Пеця;
3) накіп;
4) старшыня;
5) пыл.

**А7.** Адзначце нескланяльныя назоўнікі:
1) Маладзечна;
2) брокалі;
3) ЛіМ (газета);
4) выканкам;
5) Радзюк (жаночае прозвішча).

**А8.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме творнага склону множнага ліку могуць ужывацца з варыянтнымі канчаткамі - ***амі*** (- ***ямі***) і - ***мі*** (- ***ыма***) :
1) дзверы;
2) ружа;
3) конь;
4) косць;
5) арэх.

**А9.** Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) вярні-дуб;
2) перакаці-поле;
3) кілаватгадзіна;
4) працадзень;
5) блокпост.

**А10.** Адзначце назоўнікі, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:

1) жыццялюбства;
2) натураплата;
3) пчалаводства;
4) самалётабудаўнік;
5) нафтаздабыча.

## Частка В

Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікамі і спосабамі іх утварэння. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Бязлессе. | 1. Суфіксальны. |
| Б. Верхалаз. | 2. Нульсуфіксальны. |
| В. Перафарміраванне. | 3. Прыставачна-нульсуфіксальны. |
| Г. Сельсавет. | 4. Складана-нульсуфіксальны. |
| Д. Збор. | 5. Абрэвіяцыя. |

□□□□□□□□□□□

Таццяна Старасценка,
кандыдат філалагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ